і Лялячка такжа возьмуць напішуць Галі і Лялі па лісту ды разам і пашлеце. Толькі абавязкова гэта зрабеце. Язэп піша, што чакае на лета ў госьці. Мяркуе таксама куды ў цяплейшы край потым перабрацца. Кажа, мо’ разам куды рушым.

Дык абавязкова пашлі, Анечка, картку, а ты, Лорачка, і ты, Лялячка, напішэце лісты Галі і Лялі. Яны вам шлюць прывітаньне.

Цалую Вас моцна.

*Адам.*

## № 92. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*24 лютага 1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Сёньня прышоў Ваш ліст ка мне. Як жа ён моцна паклікаў мяне да Вас. От, здаецца, пераляцеў да Вас. Любыя мае, не сумуйце, хутка будзем усе разам ізноў. Да лета засталося ўжо нямнога.

Наступным выхадным днём, магчыма, наведаюся да Вас.

Учора я купіў Лорачцы і Лялячцы кніжкі „Гулівэр у ліліпутаў“, „Казкі пра зьвяроў“ і „Казкі“ Пушкіна. Думаў, мо’ хто будзе сёньня з Слабадзкога, каб перадаць, аж нікога ня бачыў. Заўтра вышлю бандэрольлю.

Сёньня, калі б я па магазынах шукаў матэрыі на гарнітур, нічога не знайшоў. Чаравік таксама нідзе няма. А тым часам пачалася такая адліга, што ў валёнках ніяк нельга хадзіць. Дрэнь жа якую таксама ня хочацца купляць.

Анечка, ці атрымала лістоўку, у якой я прасіў, каб ты паслала картку Язэпу, а Лорачка і Лялячка каб напісалі лісты Галі і Лялі? Калі яшчэ не паслала, пашлі абавязкова.

Я вельмі рад, што матэрыя, якую паслаў я вам, прыдасца на сукенкі і рэйтузы. Калі буду бачыць блакітнага колеру, куплю табе, Анечка. Дзякую за тваю клапатлівасьць пра мяне. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам.*

## № 93. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*26 лютага 1935 г.*

Дарагая і любая Анечка, Лорачка і Лялячка!

Меўся я наведацца да Вас 1 сакавіка, ды не ўдаецца, будзе адбывацца інвэнтарызацыя нашых складаў, мне давядзецца ў ёй браць удзел.

Жыву я па–ранейшаму. Вечарамі часам хаджу на вячэрнія заняткі і нейкі час, магчыма, прыдзецца яшчэ хадзіць у зьвязку з работай па ліквідацыі дэбітораў. Сёньня ўвечары казаў глаўбух, што гэтая работа будзе аплачана. У рабоце праходзіць увесь час. Хадзіць нікуды не хаджу. На кватэру прыходзіш ужо стаміўшыся, дык адразу на адпачынак ідзеш.

Гэтым выхадным днём хадзіў па магазінах, шукаў сабе гарнітура ці матар’ялу на гарнітур. Ні таго, ні другога не знайшоў. Нічога нідзе падхадзяшчага няма. Быў на рынку. Глядзеў сьвініны, каб купіць для Вас, дык добрае не было, і наогул у гэты раз яе было мала і ўсё дрэнная. Шукаў табе боцікаў, дык няма нідзе. А табе няма ў чым хадзіць цяпер, асабліва як от адліга пачалася.